УДК 2

# КАТЭХІЗІСЫ Ў КАТАЛІЦКІХ ШКОЛАХ БЕЛАРУСІ Ў XVI–XVIII стст.

**Самусік Андрэй Фёдаравіч,**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле аналізуюцца катэхізісы, якія ўжываліся ў каталіцкіх школах Беларусі ў XVI–XVIII стст. Адзначаецца іх спалучэнне з граматыкамі, а таксама дапаўненне гістарычнымі, геаграфічнымі і арыфметычнымі звесткамі. Паказаны працэс эвалюцыі выкарыстання дадзеных твораў у навучальных установах езуітаў ды піяраў.*

Пачатак Рэфармацыі актывізаваў рэлігійнае жыццё на абшары ўсёй Еўропы. Канкурэнцыя паміж рознымі хрысціянскімі канфесіямі за вернікаў спрыяла пашырэнню іх асветніцкай дзейнасці, арганізацыі ў гарадах публічных дыспутаў, ўзрастанню грамадскай актыўнасці насельніцтва. Значна большую ролю пачало адыгрываць і духоўнае выхаванне, бо менавіта праз яго царкоўныя іерархіі спадзяваліся ўмацаваць у пастве вернасць асновам свайго веравучэння і недапусціць развіцця ў асяроддзі святароў ды мірян імкнення да іх рэвізіі.

Не дзіўна таму, што з сярэдзіны XVI ст. у тым ліку і ў Польска-Літоўскай дзяржаве каталіцкай царквою пачынаюць выдавацца катэхізісы – творы з выкладам дагматычных палажэнняў са Св. Пісання. Вядучым багаслоўскім цэнтрам па праву лічыўся тады Кракаў, дзе выйшаў цэлы шэраг адпаведных твораў. Так, у 1566 г. ім была надрукавана польскамоўная “Навука сапраўднага хрысціяніна” прафесара мясцовага ўніверсітэта Б. Гербеста, напісаная ў форме дыялога святара і яго вучня. Падобнай формы прытрымліваўся і М. Бялобжэскі, чый катэхізіс выйшаў на польскай мове у Кракаве ў 1567 г. У 1570 г. тут убачыў свет і катэхізіс М. Кромэра на лацінскай, польскай ды нямецкай мовах, што дазваляла ўжываць яго для іх вывучэння [1, с. 33-40, 44-45].

Шмат намаганняў у плане падрыхтоўкі катэхізісаў прыклалі і езуіты. Найперш трэба вылучыць галандскага тэолага П. Канізія, які кіраваў Паўднёвагерманскай правінцыяй ордэна. Ён напісаў ажно тры катэхізіса – Вялікі (1555) і Малы (1556), а таксама – скарочаны варыянт, адаптаваны для неадукаваных асоб (1558) [2, с. 126-127]. Для выкарыстання ў школах прызначаўся “Малы катэхізіс”, які выйшаў у Брунсбергу ў 1589 г. Ён быў пашыраны практычна ва ўсіх каталіцкіх школах Рэчы Паспалітай. Нават Кракаўскі ўніверсітэт рэкамендаваў яго для ўжывання ва ўласных школах-калоніях. Выхаванцы былі абавязаны вывучыць яго цалкам на памяць: “потому, что он излагает чистое веро- и нравоучение”. Акрамя выкладу асноў каталіцкага веравучэння і пасхаліі тут была змешчана геаграфічная інфармацыя (спіс дзяржаў, правінцый ды гарадоў), а таксама сістэмы рымскіх і лацінскіх лічбаў [3, с. 32-33].

“Малы катэхізіс” П. Канізія ўжываўся і для вывучэння моў. У 1646 г. у Данцыгу было ажыццёўлена выданне гэтай працы паралельна на лацінскай ды грэчаскай мовах, што дазваляла вучням не толькі засвойваць рэлігійныя каноны, але і ўдасканальваць свае мовазнаўчыя здольнаці. Прычым, традыцыйнае размяшчэнне матэрыяла ў форме пытанняў-адказаў тут было дапоўнена літаніяй (малітва, складзеная з паўтораў кароткіх заклікаў-зваротаў), а таксама шэрагам гімнаў, якія ўжываліся езуітамі ў час багаслужэння ды тэатралізаваных пастаноўках, прысвечаных пэўным царкоўным святам [4, с. 99-111]. У XVIII ст. у друкарнях ордэну рэгулярна выходзілі і падручнікі, дзе дадзены твор дапаўняў славутую лацінскую граматыку іспанскага езуіцкага філолага Э. Альвара [5, с. 126-129].

Пашырэнне ў айчынных каталіцкіх школах з пачатку XVII ст. атрымаў і “Рымскі катэхізіс”, напісаны цэлым шэрагам тэолагаў на чале з арцыбіскупам міланскім



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

К. Барамеа па распараджэнню Трыдэнцкага сабору ў 1561–1562 гг. На латыні ён друкаваўся з 1566 г., а першы раз на польскай мове выйшаў у 1603 г. у Калішскім езуіцкім калегіўме ў Польшчы. Прычым, афіцыйным яго аўтарам тут абвяшчаўся арцыбіскуп гнезненскі, прымас С. Карнкоўскі, хаця справу перакладу і дзялення зместу на пытанні ды адказы ажыццявіў мясцовы езуіт А. Юнг. Гэты твор вызначаўся адсутнасцю рэзкай крытыкі пратэстантаў і арыентаваўся на пазітыўным выкладзе асноў хрысціянскага веравучэння, дзеля чаго тэкст быў насычаны шматлікімі маралізатарскімі сентэнцыямі [6, с. 28-29].

Прыбыўшыя ў 1642 г. у Рэч Паспалітую прадстаўнікі піярскага манаскага ордэну для выкладання ва ўласных школах абралі катэхізісы іншага езуіта – кардынала Р. Беларміна. Спачатку імі ўжываўся "Вялікі катэхізіс" для дарослых (273 пытання і адказа), выдадзены ўпершыню ў 1598 г., але ў час апрабацыі на занятках яго прызналі надзвычай складаным і нязручным. У выніку перавага была аддадзена "Малому катэхізісу" (1597), прызначанаму аўтарам якраз дзіцячай аўдыторыі (96 пытанняў ды адказаў) [7, с. 283]. Ён настолькі ўдала ўпісаўся ў піярскую вучэбную праграму, што нават славуты яе рэфарматар С. Канарскі ўключыў гэты твор у склад уласнай польска-лацінскай граматыцы (1741) [8, с. 255-272].

Неабходна таксама адзначыць, што спектр ужываемых піярамі катэхізісаў быў даволі шырокі. Так, сам С. Канарскі рэкамендаваў выкарыстоўваць катэхізіс французскага святара К. Флеры, які ў 1716–1722 г. адказваў за духоўнае выхаванне маладога Людовіка XV. Менавіта гэты асветнік стаў адным з тых, хто заклаў традыцыю стварэння так званых "гістарычных катэхізісаў", дзе хрысціянская мараль спалучалася з біблейскай гісторыяй і апісаннем першых стагоддзяў станаўлення каталіцкай царквы. У Рэчы Паспалітай першы раз ён выйшаў у 1704 г., а піярамі быў надрукаваны ў 1767 г. [9, с. 53, 89] У 1762 г. віленскія піяры перавыдалі згаданы вышэй "Рымскі катэхізіс", ачышчаны, як адзначалася на тытуле: "ад незлічоных памылак" [10, с. IV-V, XV].

Разам з тым, менавіта піяры сталі ініцыятарамі пачатку секулярызацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Сваё ўвасабленне гэта знайшло і ў пераглядзе зместу курсу маралі. Хрысціянскія каштоўнасці імі былі дапоўнены патрыятычна-ідэалагічнай састаўляючай. Першым дапаможнікам па абноўленай дысцыпліне стаў твор усё таго ж С. Канарскага "Аб выхаванні сумленнага чалавека і добрага грамадзяніна" (1754), які сучаснікі нават называлі "Катэхізісам грамадзяніна" [11, с. 35].

## Літаратура

1. Kuźmina, D. Katechizmy w Rzeczypospolitej XVI i początku XVII wieku / D. Kuźmina. – Warszawa : Wyd-wo SBP, 2002. – 185 s.

2. *Kiciński*, A. *Kierunki rozwoju katechizmów katolickich / A. Kiciński //* Roczniki Pastoralno-Katechetyczne. – 2012. – T. 4. – S. 117-138.

3. Харлампович, К. Западнорусския православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань : Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.

4. Canisius, P. Catechismus Graeco-Latinus, adjunctae sunt huic editioni selectae litaniae et preces / P. Canisius. – Dantisci : Apud G. Försterum, 1646. – 120 p.

5. Estreicher, K. Bibliografia polska : w 3 cz. / K. Estreicher. – Kraków : Druk. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1870–1939. – Cz. 3. – T. 1. – 1891. – XIX, 532, XII s.

6. Misiaszek, K. Katechizm Rzymski – Katechizm Kościoła Katolickiego. Próba porównania / K. Misiaszek // *Katechizm* w *służbie katechezy* / *red.* A. *Kiciński*. – Lublin : Wyd-wo "Natan", 2016. – S. 28-36.

7. Piotrowski, S. Katechizm w życiu Kościoła / S. Piotrowski // Studia Teologiczne. – 1993. – T. 11. – S. 279-290.

8. Konarski, S. Grammatyka Łacinska Dia Wygody Uczących Się w Szkołach Pobożnych / S. Konarski. – Warszawa : Druk. XX. Scholarum Piarum, 1776. – 272 s.

9. Корзо, М.А. Украинская и белорусская катехетическая традиция конца XVI – XVIII в. : становление, эволюция и проблема заимствований / М.А. Корзо. – Москва : «Канон +», 2007. – 672 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. Katechizm Rzymski Z Dekretu S. Koncilium Trydentskiego Za Rozkazem S. Piusa V. Papieża Połacinie Wydany. Na Polski ięzyk powagą Stanisława Karnkowskiego przetłumaczony y wydrukowany w Kaliszu R.P. 1603, teraz zaś z nieźliczonych omyłek oczyszczony. – Wilno : Druk. XX. Scholarum Piarum, 1762. – XV, 320 s.

11. Самусик, А.Ф. Методическое обеспечение воспитательного процесса в школах Комиссии по народному просвещению Речи Посполитой (1773–1795) / А.Ф. Самусик // Wschodnioeuropejskie Czasopismo Naukowe. – 2016. – № 5. – Cz. 1. – S. 34-38.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова